ISSN 3072-3140, eISSN 3072-4376
Copyright © by Radosław Kaleta, 2025
Creative Commons Attribution-NonComercial 4.0
(CC BY-NC 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/uw.ijbg.2025.7

Радаслаў Калета ♦ Radosław Kaleta

Варшаўскі ўніверсітэт, Польшча
University of Warsaw, Poland
ORCID: https://orcid.org/0000-0001-6892-9332
e-mail: rkaleta@uw.edu.pl

Да 10-годдзя майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі Варшаўскага ўніверсітэта

On the 10th Anniversary of the Belarusian Language Teaching Workshop at the University of Warsaw

Рэзюмэ: У тэксце прадстаўлена 10-гадовая дзейнасць майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі, якая з 2015 г. працуе пры кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта. Праца майстэрні была засяроджана на навуковай дзейнасці, падрыхтоўцы навуковых канферэнцыяў і навуковых і глотадыдактычных публікацыяў, развіцці міжнароднага супрацоўніцтва і папулярызацыі беларускай мовы і культуры па-за межамі Беларусі. Прадстаўлены асноўныя дасягненні і планы майстэрні.

Ключавыя словы: беларусістыка, глотадыдактыка, беларуская мова, міжнароднае супрацоўніцтва, Варшаўскі ўніверсітэт.

Abstrat: The article presents the 10-year history of the Belarusian Studies Language Teaching Workshop, which has been operating at the Department of Belarusian Studies of the University of Warsaw since 2015. The Workshop's activities have focused on academic research, the organisation of scholarly conferences, the publication of academic and language-teaching materials, the development of international cooperation, and the promotion of the Belarusian language and culture beyond Belarus. The article highlights the Workshop's main achievements and outlines its future plans.

Keywords: Belarusian Studies; language teaching; Belarusian language; international cooperation; University of Warsaw.

Майстэрня беларусістычнай глотадыдактыкі афіцыйна была пакліканая да жыцця на факультэце прыкладной лінгвістыкі пры кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта 1 снежня 2015 г.

Ідэя заснаваць майстэрню (як і навукова-метадычны часопіс, гл. Калета 2017; Калета 2021) з'явілася яшчэ падчас VI Міжнароднага кангрэса беларусістаў, які праходзіў у Мінску ў траўні



Ілюстрацыя 1. Лагатып майстэрні

2015 г. Адной з буйнейшых секцый Кангрэса была секцыя *Беларуская мова як замежная*. Яе пасяджэнне адбылося ў кабінеце прафесара Аляксандра Лукашанца, які на той час займаў пасаду дырэктара Інстытута мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У працы секцыі бралі ўдзел прадстаўнікі розных навуковых устаноў Беларусі, Польшчы і Японіі. Сярод іх былі Лідзія Сямешка з Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Вольга Барысенка і Аксана Семянькевіч з Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Надзея Старавойтава з Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, якая ў той час выкладала беларускую мову ў Кіеўскім нацыянальным універсітэце. У секцыі таксама ўдзельнічала Ларыса Станкевіч з Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, якая выкладала беларускую мову ў Будапешцкім універсітэце імя Лоранда Этвеша. Японскі бок прадстаўляла Сіёры Кіёсава з Цукубскага ўніверсітэта, Польшчу – Міраслаў Янковяк з Інстытута славістыкі Польскай акадэміі навук, Агнешка Гораль з Люблінскага ўніверсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай і Радаслаў Калета з кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта, які быў таксама мадэратарам секцыі Дыскутантам была прафесар Ларыса Пісарэк з Уроцлаўскага ўніверсітэта. Даклады слухалі не толькі ўдзельнікі секцыі, але і іншыя госці Кангрэса, студэнты і навукоўцы. Сярод іх былі Алена Анісім з Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і Аляксандр Скапненка з Нацыянальнай акадэміі навук Украіны.

Важна адзначыць, што секцыя, прысвечаная беларускай мове як замежнай, была арганізаваная не ўпершыню. Яшчэ падчас V Міжнароднага кангрэса беларусістаў у 2010 г. дзейнічала падобная панэль, хаця яна была меншай па маштабе. У 2015 г. адбылася чарговая двухтыднёвая міжнародная летняя школа беларусісыткі, арганізаваная Лідзіяй Сямешкай пры падтрымцы дац. д-р Людмілы Кажухоўскай на базе кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы ў Мінску [больш гл. Мядзведская 2016; Сямешка 2018], у якой аўтар гэтых слоў як намеснік загадчыцы кафедры беларусістыкі ВУ таксама прыняў удзел. Годам раней, у 2014 г., Таварыства беларускай мовы выдала цыкл з шасці тэстаў для ацэнкі валодання беларускай мовай як замежнай [гл. напр., Барысенка і інш. 2014]. У 2010–2015 гг. (але і раней) выдаваліся таксама падручнікі і дапаможнікі па беларускай мове для розных груп навучэнцаў, напр. для рускамоўных, для жыхароў краін СНД, для нямецкіх, польскіх і славацкіх студэнтаў і інш. [больш гл. Калета 2018]. На гэтай хвалі рэнесансу зацікаўлення выкладаннем і вывучэннем беларускай мовы як замежнай узнікла і варшаўская майстэрня, хаця на кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта вяліся ўжо міждысцыплінарныя глотадыдактычныя даследаванні і з 1956 г. выкладалася беларуская мова як успадкаваная і замежная, таму кафедра ўдзельнічала ў розных такога кшталту ініцыятывах і горача іх падтрымлівала. Майстэрня атрымлівала натхненне ад розных мерапрыемстваў, якое перадавала іншым выкладчыкам і навукоўцам.

Пазітыўным з'яўлялася тое, што навуковыя сустрэчы, тэматычна звязаныя з беларускай мовай як замежнай, адбываліся рэгулярна як у Беларусі, так і за яе межамі (напр. у Польшчы, Нямеччыне, ЗША). Немагчыма апісаць усе секцыі і даклады, але варта падаць прыклады. Так, у 2016 годзе кафедра сучаснай беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта правяла Міжнародную навуковую канферэнцыю *Мова – Літаратура – Культура* (гл. зборнік *Мова – Літаратура – Культура...*, прысвечаны 90-годдзю прафесара Льва Міхайлавіча Шакуна). У межах гэтай канферэнцыі беларускія, рускія і польскія даследчыкі таксама выступалі з дакладамі на тэму выкладання беларускай мовы як замежнай. Акрамя таго, у 2017 г. Надзея Старавойтава арганізавала падобную секцыю на Кангрэсе даследчыкаў Беларусі ў Каўнасе, што ўжо сталася пэўнай традыцыяй і на наступных кангрэсах [Калета 2017: 8–9] (у 2025 г. у Берліне Н. Старавойтава не змагла працягнуць сваю працу і таму

Да 10-годдзя майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі…

з арганізацыйнай ініцыятывай выступіла Вольга Трацяк з кафедры беларусістыкі, сябра майстэрні [гл. Трацяк 2025: 334]). Праца секцыі, прысвечанай беларускай мове як замежнай, працягвалася падчас розных канферэнцыяў і працягваецца да сённяшняга дня, а для назвы секцыі выкарыстоўваецца фармулёўка *беларусістычная глотадыдактыка*, што з'явілася ў назве нашай майстэрні.

Адной з мэт майстэрні было пачаць навуковую тэрміналагічную дыскусію [гл. Kaleta 2018: 57–110; Калета 2019] і падрыхтаваць дэфініцыі такіх фармулёвак, як *беларуская мова як замежная*, *лінгвадыдактыка* (тэрмін, папулярны ў Беларусі пад уплывам савецкай традыцыі), *беларусістычная глотадыдактыка* (тэрмін, які папулярызуцца майстэрняй), *дыдактыка*, *методыка* і інш. Тэрмін *беларусістычная глотадыдактыка* стаў часцей выкарыстоўвацца ў беларускай мове, напр. Надзеяй Старавойтавай, Лідзіяй Сямешкай і маладымі навукоўцамі.

У розныя гады ў даследчую групу майстэрні ўваходзілі супрацоўнікі кафедры беларусістыкі ВУ: Радаслаў Калета (кіраўнік), Андрэй Масквін, Вольга Трацяк, але таксама прадстаўнікі іншых навуковых асяродкаў: Міраслаў Янковяк (Чэшская акадэмія навук), Лідзія Сямешка (Беларусь, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы), Вольга Барысенка (Беларусь, Мінскі лінгвістычны ўніверсітэт, потым Кітай, Сіянскі ўніверсітэт замежных моў), Надзея Старавойтава (Беларусь, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт), Вераніка Бандаровіч (Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, потым Інстытут сучасных ведаў). Майстэрня беларусістычнай глотадыдактыкі, нягледзячы на фармальную прыналежнасць да структур факультэта прыкладной лінгвістыкі і кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта, была і ёсць адкрытая для міжнароднага і міждысцыплінарнага ўзаемадзеяння, таму што ўжо пры падрыхтоўцы навуковага часопіса супрацоўнічае з даследчыкамі розных краін, напр. з Беларусі, Кітая, Польшчы, Украіны, Вялікабрытаніі і ЗША. Да ўзаемадзеяння запрашаюцца ўсе зацікаўленыя. Плануцца новы набор кадраў для майстэрні, якая будзе запрашаць да супрацоўніцтва маладых навукоўцаў, аспірантаў, а таксама выкладчыкаў беларускай мовы, якія захочуць дзяліцца сваім досведам працы з дарослымі і дзецьмі ў Беларусі і за мяжой.

Майстэрня з 2017 г. выдае навукова-метадычны часопіс, які да 2023 года меў назву "Беларуская мова як замежная", а з 2024 г. – "International Journal of Belarusian Glottodidactics" (Беларусістычная глотадыдактыка). Пра часопіс шмат пісалася ў іншых месцах [гл. Калета 2017; Калета 2021], таму тут адзначым толькі новыя факты: 1) д-р Яўгенія Міронава з Гарвардскага ўніверсітэта (Бостан, ЗША) стала сябрам навуковай рады і выконвае экспертную, кансультацыйную і амбасадарскую ролю; 2) часопіс мае новы сайт (архівальная старонка таксама даступная), які можна адкрыць дзякуючы наступнаму QR-коду:

3) часопіс змяніў назву ў сувязі з новай рэчаіснасцю. Спачатку на кафедры беларусістыкі вучыліся прадстаўнікі беларускай нацменшасці ў Польшчы (дарэчы, перад усім для іх была створаная кафедра ў 1956 г., гл. Баршчэўскі 2010: 354; Калета 2023: 137), потым пачалі паступаць замежнікі, у асноўным палякі, але не толькі, таксама прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў (напр. з Расіі, Іспаніі, Літвы), а цяпер усё часцей на кафедру прыходзяць прадстаўнікі г.зв. новай беларускай эміграцыі, якія хочуць вярнуць у свой ужытак беларускую мову. Сёння ўсё больш прадстаўнікоў беларускай эміграцыі апошніх гадоў, якія вывучаюць беларускую мову, хутчэй за ўсё, як адноўленую. Мэты і метады навучання беларускай мове як роднай, успадкаванай, замежнай і адноўленай – хаця могуць мець пункты судакранання – адрозніваюцца. Таму часопіс і майстэрня маюць цяпер шырэйшае поле навукова-метадычных інтарэсаў. Дадатковая мэта – гэта папулярызацыя беларускай мовы ў свеце, таму ў часопісе

друкуюцца таксама тэксты па-англійску для заходніх навукоўцаў і выкладчыкаў.

Акрамя гэтага, майстэрня мае на мэце выконваць наступныя задачы:

- развіццё міждысцыплінарных глотадыдактычных даследаванняў;
- даследаванні лінгвакультуралагічнага аспекту выкладання беларускай мовы;
- вывучэнне ўплыву сацыялінгвістыкі і моўнай палітыкі на выкладанне беларускай мовы;
- развіццё даследаванняў па культуралагічнай лінгвістыцы (беларусазнаўства, этналінгвістыка, краязнаўства) і міжкультурнай камунікацыі;
- развіццё даследаванняў па выкладанні беларускай культуры (месца культуры ў працэсе выкладання мовы; моўны этыкет; стэрэатыпы ў навучальных дапаможніках, табуяваныя тэмы; ідэалізацыя герояў падручнікаў);
- развіццё даследаванняў па параўнальнай глотадыдактыцы (напрыклад польска-беларускай, польска-беларуска-рускай, беларуска-рускай, беларуска-нямецкай і інш.); паколькі майстэрня працуе ў Польшчы, тут праводзяцца таксама даследаванні вывучэння польскай мовы беларусамі (напр. Kaleta 2015; Kaleta 2025; Калета 2025);
- аналіз і параўнанне метадаў навучання, праграм курсаў і ролі настаўніка;
- аналіз пытанняў сертыфікацыі беларускай мовы як замежнай (узроўні сертыфікатаў, матэрыялы, неабходныя для пэўнага ўзроўню, метады падрыхтоўкі да сертыфікацыйных экзаменаў і шаблоны тэстаў);
- падрыхтоўка навучальных праграм для розных узроўняў вывучэння мовы;
- распрацоўка ўзораў матэрыялаў, практыкаванняў, заняткаў па беларускай мове як замежнай, успадкаванай і адноўленай з выкарыстаннем новых тэхналогій;
- аналіз выкарыстання новых тэхналогій і мастацкіх тэкстаў (арыгінальных або спрошчаных) падчас заняткаў у інтэрнацыянальных і этнічна аднародных групах (славянскіх і неславянскіх);
- даследаванні ўспрымання беларускай мовы замежнікамі;
- аналіз моўных памылак і т.зв. пераходнай мовы, а таксама вымаўлення;
- даследаванне праблем адукацыі і працы выкладчыкаў беларускай мовы ў Беларусі і за мяжой;
- маніторынг сітуацыі з беларускай мовай у розных краінах;
- міграцыйная лінгвістыка (моўная сітуацыя ў беларускіх дыяспарах; мова дзяцей эмігрантаў і адукацыя ва ўмовах шматмоўя; моўны кантакт, запазычанні і пераключэнне кодаў; уплыў міграцыі на мову мігрантаў і інш.).

Сябры майстэрні ўдзельнічалі ў шматлікіх канферэнцыях і секцыях па беларусістычнай глотадыдактыцы, якія ўзгадваліся вышэй і ладзіліся на розных навуковых сустрэчах у Беларусі і па-за яе межамі. Таму не было неабходнасці часта арганізоўваць такія мерапрыемствы ў Варшаве. З двума выключэннямі. 13 мая 2021 г. адбылася анлайн-канферэнцыя "Беларуская глотадыдактыка – гісторыя, сучасны стан і перспектывы. Да 5-годдзя майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі". Заяўлена было 13 дакладаў. На адкрыцці канферэнцыі выступілі: 1) праф., д.п.н. Ганна Валочка (галоўны навуковы супрацоўнік Лабараторыі гуманітарнай адукацыі, Нацыянальны інстытут адукацыі, г. Мінск) з дакладам *Асноўныя кампаненты сістэмы навучання беларускай мове як замежнай*; 2) к.ф.н. Лідзія Сямешка (вядучы навуковы супрацоўнік Лабараторыі гуманітарнай адукацыі, Нацыянальны інстытут адукацыі, г. Мінск) з дакладам *Мэты вывучэння і выкладання беларускай мовы як замежнай у кантэксце дзейнаснай парадыгмы*; 3) праф., д.ф.н. Вольга Ляшчынская (кафедра беларускай мовы, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны) з дакладам *Фразеалагізмы – крыніца пазнання і сродак развіцця культурна-моўнай кампетэнцыі*; 4) дацэнт, к.ф.н. Алена Палуян (дэкан філалагічнага факультэта, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны) з дакладам *Нацыянальна афарбаваная лексіка на занятках па беларускай мове*; 5) д.г.н. Андрэй

Да 10-годдзя майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі…

Масквін (кафедра беларусістыкі, Варшаўскі ўніверсітэт) з дакладам *Падручнік па беларускай мове для замежнікаў: якім ён павінен быць?*; 6) д.ф.н. Радаслаў Калета (кафедра беларусістыкі, Варшаўскі ўніверсітэт) з дакладам *Хто і навошта вывучае беларускую мову ў Польшчы?*.

Пасля дыскусіі і перапынку выступілі наступныя ўдзельнікі канферэнцыі: 1) дацэнт, к.ф.н. Алена Калечыц (кафедра русістыкі, філасофскі факультэт Універсітэт імя Канстанціна Філосафа, Славакія) з дакладам *Імпліцытны характар формул прабачэння ў маўленчых паводзінах беларусаў*; 2) мгр Ірына Агеева (кафедра беларусістыкі, Варшаўскі ўніверсітэт) з дакладам *"Несур'ёзныя" заданні на занятках па беларускай мове як замежнай*; 3) PhD-лектар Уладзіслаў Іваноў (Еўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт, г. Вільня, Літва) з дакладам *Табуізацыя і эўфэмізацыя беларускай сэксуальнай і плоцевай лексыкі: сацыялінгвістычны аналіз*; 4) мгр Віктар Корбут (кафедра міжкультурных даследаванняў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, Варшаўскі ўніверсітэт) з дакладам *Праблематыка школьнай адукацыі на беларускай мове і выкладання беларускай, рускай і польскай моў у школе на старонках газеты "Наша Нива"* (*„Nasza Niwa"*) *у 1906–1907 гг.*; 5) mgr Daria Leoniuk (Katedra Białorutenistyki, Uniwersytet Warszawski) з дакладам *Taraszkiewica, narkamauka, gwary – nauka języka białoruskiego w otoczeniu wielu wariantów językowych oraz dialektów białostocczyzny.*

Завочна ўдзельнічалі ў канферэнцыі: 1) д.ф.н. Ганна Жаброўская (Інстытут рускай і ўкраінскай філалогіі, Універсітэт імя Адама Міцкевіча ў Познані) з дакладам *З практыкі выкладання беларускай мовы як замежнай у Інстытуце рускай і ўкраінскай філалогіі ва Універсітэце імя Адама Міцкевіча ў Познані*; 2) дацэнт, к.ф.н. Вольга Шахаб (Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў, г. Цяньцзінь, Кітайская Народная Рэспубліка) з дакладам *Асаблівасці навучання кітайскіх студэнтаў беларускаму вымаўленню.*

7 красавіка 2025 г. у рамках Міжнароднай навуковай канферэнцыі *Польска-беларускія моўныя, літаратурныя, культурныя і гістарычныя сувязі*, якая ладзілася кафедрай беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта 7–8 красавіка 2025 г. у Варшаве, адбылася секцыя *Беларуская глотадыдактыка – гісторыя, сучасны стан і перспектывы. Да 10-годдзя майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі на кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта.*

На гэтай секцыі прагучала 7 дакладаў, выступілі: 1) Радаслаў Калета (кафедра беларусістыкі, Варшаўскі ўніверсітэт) з дакладам *Дасягненні майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі і сучасны стан беларускай мовы*; 2) Паліна Маслянкова (незалежная даследчыца) з дакладам *Мова і тоеснасць: аналіз запатрабаванасці і матывацыі вывучэння беларускае мовы сярод дарослых беларусаў у Беларусі і за мяжой*; 3) Святлана Лясовіч (Інстытут беларускае мовы, Познань, Польшча) з дакладам *Беларуская мова як складнік праграмы курса "Беларусазнаўства"*; 4) Аксана Забаштанская (Інстытут беларускае мовы, Познань, Польшча) з дакладам *Актуальныя праблемы распрацоўкі паўзроўневага вучэбнага комплексу па беларускай мове як замежнай*; 5) Лілея Плыгаўка (Інстытут беларускае мовы, Познань, Польшча) з дакладам *Класіфікацыя і шляхі пераадолення тыповых памылак пры вывучэнні беларускай мовы дарослай катэгорыяй вучняў*; 6) Вікторыя Ляшук (Універсітэт Матэя Бела ў Банскай Быстрыцы, Славакія) з дакладам *Канцэптуальныя аспекты выкладання беларускай мовы ў Славакіі ў параўнанні з Польшчай: гісторыя, сучаснасць і перспектывы*; 7) Hanna Halavina (Uniwersytet w Białymstoku) з дакладам *Zastosowanie podejścia ecolingwistycznego w nauce języków polskiego i białoruskiego na przykładzie jednej lekcji*. Частка дакладаў была перароблена аўтарамі ў навуковыя артыкулы і надрукаваная ў часопісе майстэрні.

Варта адзначыць, што двое сяброў майстэрні (Вольга Трацяк і Радаслаў Калета) з'яўляюцца экспертамі польскага Міністэрства адукацыі ў галіне падручнікаў, прызначаных для агульнай адукацыі, па беларускай мове і не раз рэцэнзавалі падручнікі для беларускай нацыянальнай



Ілюстрацыя 2. Плакат са звесткамі пра секцыю да 10-годдзя майстэрні (аўтар А. Масквін)

меншасці. Таксама ўдзельнічаюць у працы Камандны па сертыфікацыі ўзроўню валодання мовай пры Варшаўскім універсітэце, дзе займаюцца беларускай мовай, паколькі Варшаўскі ўніверсітэт праводзіць экзамены і выдае сертыфікаты, якія пацвярджаюць валоданне беларускай мовай [больш гл. Tratsiak 2024]. Р. Калета пісаў рэцэнзію беларускага праекта *Распрацоўка Дзяржаўнага адукацыйнага стандарту і тыпавых тэстаў па беларускай і рускай мовах як замежных. Заданне дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гады. 13. Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства (падпраграма 13.6. Адукацыя)* (кіраўнікі: доктар фіз.-мат. навук, прафесар В. А. Гайсёнак і канд. філ. навук, дацэнт, прафесар Л. І. Сямешка).

Немагчыма таксама ў кароткім тэксце прывесці ўсе публікацыі, якія былі напісаныя ў рамках майстэрні або сябрамі майстэрні як індывідуальныя праекты, але кожны сябра майстэрні мае цікавы навуковы, дыдактычны і практычны (як выкладчык) даробак у галіне беларусістычнай глотадыдактыкі. Як прыклад можна назваць некалькі выданняў. *Памылкалогія ў беларусістычнай глотадыдактыцы* [Kaleta 2018] – гэта першая манаграфія, прысвечаная беларускай мове як замежнай на прыкладзе аналізу выклікаў і памылак польскіх студэнтаў розных польскіх універсітэтаў, якія вывучалі беларускую мову. *50 практыкаванняў па беларускай мове* [Kaleta (рэд.) 2020] – гэта пазіцыя, адрэдагаваная ў адным асобным і зручным для карыстання сшытку на аснове практыкаванняў з падручніка Тэрэсы Ясіньскай – супрацоўніцы на пенсіі кафедры беларусістыкі [гл. Jasińska-Socha, Chylak-Schroeder, Głuszkowska-Babicka 2017]. *Папулярная беларуская граматыка для замежнікаў* [Kaleta 2021] – гэта спроба даць кароткую фанетычную і граматычную інфармацыю замежнікам (польскамоўным навучэнцам, палякам і тым, хто ведае польскую мову і хоча за яе пасярэдніцтвам вывучаць беларускую) без складанай лінгвістычнай тэрміналогіі і з сучаснай лексікай. Варта таксама назваць апошнія выданні дзвюх супраоўцніц майстэрні як іх індывідуальныя праекты. *Беларуская мова. Практыкаванні і тэксты для чытання* [Трацяк 2025a] – гэта дапаможнік, які аб'ядноўвае практыкаванні і тэксты для чытання, забяспечвае паслядоўнае і сістэматычнае развіццё моўных кампетэнцыяў, у прыватнасці навыкаў разумення пісьмовага тэксту, пашырэння слоўнікавага запасу і павышэння граматычнай дакладнасці. Можна з ім працаваць або з выкладчыкам, або самастойна, калі валодаем беларускай на пэўным узроўні, таму што на канцы пададзены ключ да практыкаванняў. Другі падручнік пад назвай *Хто? Дзе? Калі? Беларусь у адказах на граматычныя ды арфаграфічныя пытанні* падрыхтавала для студэнтаў беларусістыкі Вераніка Бандаровіч [гл. Бандаровіч 2025]. Дапаможнік паказвае выбраныя цяжкія месцы беларушчыны і дае іх тлумачэнні, тэксты і практыкаванні. Спіс астатніх публікацыяў можна знайсці на сайце майстэрні дзякуючы наступнаму QR-коду:

Да 10-годдзя майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі…

Сёння выклікам для майстэрні (як і для ўсіх выкладчыкаў) з'яўляецца даследаванне выкарыстання штучнага інтэлекту пры выкладанні і вывучэнні беларускай мовы на розных узроўнях. Як адзначалася вышэй, плануецца таксама абнаўленне кадравага складу майстэрні і запрашэнне да супрацоўніцтва маладых навукоўцаў, аспірантаў, якія выраслі ўжо ў эры новых тэхналогіяў. Хацелася б дачакацца ў майстэрні таксама абароны першай у Польшчы кандыдацкай дысертацыі ў галіне беларусістычнай глотадыдактыкі (шанц ёсць, бо вядома пра зацікаўленасць такой магчымасцю). Спадзяёмся на супрацу таксама з выкладчыкамі, якія вучаць беларускай мове дзяцей і дарослых у краінах, дзе пражывае беларускай дыяспара. Дакладна, на наступныя гады прыцы хопіць ўсім зацікаўленым.

Сяброў майстэрні з юбілеем павіншавала кіраўніцтва Беларускага інстытута ў Празе і Інстытута беларускае мовы. Вось змест дасланых віншавальных лістоў.

Віншавальныя лісты

Běloruský institut v Praze

Шаноўныя калегі!
Прыміце нашы шчырыя віншаванні да 10-годдзя Майстэрні беларускай глотадыдактыкі.

Ваша праца ў галіне глотадыдактычных даследаванняў служыць для многіх узорам і натхняльным прыкладам – як падыходзіць да вырашэння складаных даследчых і дыдактычных праблем. Вынікі Вашых даследаванняў дапамагаюць пераадолець межы і адчыняюць дзверы ў свет беларускай мовы для людзей па ўсім свеце. Беларуская мова за мяжой у апошнія гады аб'ядноўвае шырокую беларускую супольнасць, што патрабуе ад беларусазнаўцаў новых падыходаў да пастаўленых задач.

Беларускі інстытут у Празе шчыра зычыць Вам – даследчай групе *Майстэрні беларускай глотадыдактыкі* –

быць

асілкамі ў справе барацьбы з памылкамі;
багацеямі ў назапашаным матэрыяле;
волатамі ў нялёгкай справе выкладання.

Зычым Вам здароўя і асабістых поспехаў у развіцці беларускай глотадыдактыкі.

Ад імя Беларускага інстытута ў Празе
Ніна Скеп'ян, Іна Каліта

Інстытут беларускае мовы віншуе Майстэрню беларусістычнай глотадыдактыкі з 10-годдзем плённай працы!

Прыміце глыбокую падзяку за ўнёсак у развіццё і падтрымку беларускай мовы. Зычым новых далеглядаў, плёну і рэалізацыі ўсіх задум і планаў на ніве беларусістыкі!

Дзякуем Радаславу Калету за нястомнасць у кіраванні нялёгкай справай. Хай імпэт і навуковае натхненне дапамогуць вынікова прыйсці да наступных угодкаў!

З боку Інстытута беларускай мовы выказваем зацікаўленасць у сумесных праектах і супольнай працы!

Святлана Лясовіч

References

Бандаровіч Вераніка. 2025. *Хто? Дзе? Калі? Беларусь у адказах на граматычныя ды арфаграфічныя пытанні. Варшава: Кафедра беларусістыкі ВУ [Bandarovič Veranika. 2025. Xto? DZe? Kali? Belarus'u adkazax na hramatyčnyja dy arfahrafičnyja pytanni. Varšava: Kafedra belarusistyki VU].*

Баршчэўскі Аляксандр. 2010. *"Нам памагала тое, што ў Беларусі стан з моваю дрэнны". Прафесар Аляксандр*

Баршчэўскі пра беларусістыку ў Варшаве. "Arche. Пачатак" 4: 353–357 [Barščèŭski Aljaksandr. 2010. *"Nam pamahala toe, što ŭ Belarusi stan z movaju drènny". Prafesar Aljaksandr Barščèŭski pra belarusistyku ŭ Varšave*. "Arche. Pačatak" 4: 353–357].

Барысенка Вольга, Кныш Ларыса, Куліковіч Уладзімір, Літвіноўская Алеся, Рамза Таццяна, Семянькевіч Святлана. 2014. *Тэст па беларускай мове як замежнай. Базавы ўзровень*. Мінск: Выдавецкі дом Грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" [Barysenka Vol'ha, Knyš Larysa, Kulikovič Uladzimir, Litvinoŭskaja Alesja, Ramza Taccjana, Semjan'kevič Svjatlana. 2014. *Tèst pa belaruskaj move jak zamežnaj. Bazavy ŭzroven'*. Minsk: Vydavecki dom Hramadskaha ab'jadnannja "Tavarystva belaruskaj movy imja Franciška Skaryny"].

Калета Радаслаў. 2017. *Часопіс "Беларуская мова як замежная" ў даследаваннях беларусістычнай глотадыдактыкі*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 1: 7–12 [Kaleta Radaslaŭ. 2017. *Časopis "Belaruskaja mova jak zamežnaja" ŭ dasledavannjax belarusistyčnaj hlotadydaktyki*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 1: 7–12].

Калета Радаслаў. 2018. *Выбраныя матэрыялы па вывучэнні беларускай мовы як замежнай (1973 – 2017 гг.)*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 2: 28–36 [Kaleta Radaslaŭ. 2018. *Vybranyja matèryjaly pa vyvučènni belaruskaj movy jak zamežnaj (1973 – 2017 hh.)*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 2: 28–36].

Калета Радаслаў. 2019. *Беларусістычная глотадыдактыка як паўнавартасная галіна навукі*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 3: 7–18 [Kaleta Radaslaŭ. 2019. *Belarusistyčnaja hlotadydaktyka jak paŭnavartasnaja halina navuki*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 3: 7–18].

Калета Радаслаў. 2021. *Да 5-годдзя часопіса Беларуская мова як замежная*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 5: 50–51 [Kaleta Radaslaŭ. 2021. *Da 5-hoddzja časopisa Belaruskaja mova jak zamežnaja*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 5: 50–51].

Калета Радаслаў. 2023. *Выбраныя факты з гісторыі беларусістыкі ў Варшаве ў святле архіўных дакументаў*. У: Калета Радаслаў (рэд.). *Спазнаючы Беларусь… Да 65-годдзя беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта*. Варшава: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego. 135–144 [Kaleta Radaslaŭ. 2023. *Vybranyja fakty z historyi belarusistyki ŭ Varšave ŭ svjatle arxiŭnyx dakumentaŭ*. U: Kaleta Radaslaŭ (rèd.). *Spaznajučy Belarus'… Da 65-hoddzja belarusistyki Varšaŭskaha ŭniversitèta*. Varšava: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego. 135–144].

Калета Радаслаў. 2025. *Мая беларусістыка. З польска-беларускіх лінгвістычных і глотадыдактычных даследаванняў*. Варшава: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego [Kaleta Radaslaŭ. 2025. *Maja belarusistyka. Z poľska-belaruskix linhvistyčnyx i hlotadydaktyčnyx dasledavannjaŭ*. Varšava: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego].

Мова – Літаратура – Культура. Матэрыялы VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі (да 90-годдзя прафесара Льва Міхайлавіча Шакуна), Мінск, 15–16 верасня 2016 г. У дзвюх частках, у аўтарскай рэдакцыі, Мінск 2016 [*Mova – Litaratura – Kul'tura. Matèryjaly VIII Mižnarodnaj navukovaj kanferèncyi (da 90-hoddzja prafesara L'va Mixajlaviča Šakuna), Minsk, 15–16 verasnja 2016 h. U dzvjux častkax*, u aŭtarskaj rèdakcyi, Minsk 201.].

Мядзведская Кацярына. 2016. *Па-беларуску – цікава!*. "Голас Радзімы". Чацвер, 7 красавіка 2016 г. № 12 (3468): 1–2 [Mjadzvedskaja Kacjaryna. 2016. *Pa-belarusku – cikava!*. "Holas Radzimy". Čacver, 7 krasavika 2016 h. № 12 (3468): 1–2].

Сямешка Лідзія. 2018. *Міжнародная летняя школа беларусістыкі: мэты і матывы вывучэння беларускай мовы*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 2: 13–18 [Sjameška Lidzija. 2018. *Mižnarodnaja letnjaja škola belarusistyki: mèty i matyvy vyvučènnja belaruskaj movy*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 2: 13–18].

Трацяк Вольга. 2025a. *Беларуская мова. Практыкаванні і тэксты для стачытання. Варшава: Кафедра беларусістыкі ВУ [Tracjak Vol'ha. 2025a. Belaruskaja mova. Praktykavanni i tèksty dlja stačytannja. Varšava: Kafedra belarusistyki VU]*.

Трацяк Вольга. 2025b. *Дванаццаты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі (25–27 верасня 2025, Берлін)*. "Acta Albaruthenica" 25: 331–336 [Tracjak Vol'ha. 2025b. *Dvanaccaty Mižnarodny Kanhrès dasledčykaŭ Belarusi (25–27 verasnja 2025, Berlin)*. "Acta Albaruthenica" 25: 331–336].

Jasińska-Socha Teresa, Chylak-Schroeder Teresa, Głuszkowska-Babicka Jadwiga. 2017. *Język białoruski (poziom podstawowy i średnio zaawansowany. Red. Radosław Kaleta. Warszawa:* Katedra Białorutenistyki UW.

Kaleta Radosław. 2015. *Polsko-białoruska lapsologia glottodydaktyczna*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW.

Kaleta Radosław. 2018. *Błędologia w glottodydaktyce białorutenistycznej*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki, Pracownia Glottodydaki Białorutenistycznej.

Kaleta Radosław (red.). 2020. *50 ćwiczeń z języka białoruskiego*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW.

Kaleta Radosław. 2021. *Popularna gramatyka białoruska dla obcokrajowców*. Warszawa: Radosław Kaleta.

Kaleta Radosław. 2025. *Światło w ciemności: interwencyjna glottodydaktyka pomocowa wobec traumy uchodźczej. Uczelniane kursy dla Białorusinów*. "Języki Obce w Szkole" 3: 29–40.

Tratsiak Volha. 2024. *Egzamin certyfikacyjny z języka białoruskiego jako obcego na poziomach: B1 i B2 na Uniwersytecie Warszawskim*. "International Journal of Belarusian Glottodidactics" 8: 48–61.